**Іконнікава Л.У. (Мінск, Беларусь)**

## Вобраз *горад* у беларускай літаратуры XX – пачатку XXI стагоддзяў

Сучасная беларуская літаратура ўсё часцей звяртаецца да праблемы існавання асобы ў межах сучаснай цывілізацыі, што ў сваю чаргу прыводзіць да станаўлення “гарадскога” тэксту, рэпрэзентацыі гарадскіх топасаў у творах. Канструяванне тэкстаў, у якіх горад пачынае функцыянаваць як самадастатковы мастацкі вобраз, звычайна рэалізуецца з дапамогай пабудовы пэўных прасторава-часавых мадэляў: “Сена на асфальце”, “Блакітны вецер”, “І зноў, зноў горад” М. Стральцова, творы А. Глобуса, раман Г. Марчука “Сава Дым і яго палюбоўніцы”, аповесць М. Южыка “Горад, які яны засялілі”, А. Казлова “Горад у нябёсах (учора, сёння, заўтра)”. Па сцвярджэнні В. Акудовіча, гарадская літаратура – “гэта такі тып вобразнасці, які сфармаваны рэаліямі гарадскога існавання і вывераны сістэмай эстэтычных і этычных каардынатаў урбаністычнай культуры” [3, с. 181].

У рамане Г. Марчука “Сава Дым і яго палюбоўніцы” горад арганізуе прастору твора. Пісьменнік будуе дзве яго мадэлі: прасторавую і псіхалагічную. Аўтар зыходзіць з таго, што горад ёсць пэўная канструкцыя, якую можна спраектаваць і ўвасобіць у жыццё да самых дробных дэталей арганізацыі вытворчасці і побыту. Горад у Г. Марчука – гэта непастаянная існасць, якая знаходзіцца ўвесь час у дынаміцы. Неаднаразова падкрэсліваецца рост і павелічэнне тэрыторыі населенага пункта. У творы няма закончанага, цэласнага апісання горада. Аўтар падае пэўныя вобразы, адлюстроўвае дэталі гарадской рэчаіснасці, перадае ўражанні і адчуванні герояў ад яго.

У рамане Мінск (менавіта ў ім адбываецца дзеянне) – выява горада, якая ўключае ў сябе ўсю шматграннасць сацыяльнага і духоўнага жыцця чалавека. У індывідуальнай свядомасці герояў рамана горад першапачаткова існуе на эмацыянальным узроўні, у выглядзе прататыпічнай мадэлі паводзін, арганізацыі пэўнай паслядоўнасці думак, жаданняў, пачуццяў. Гэтая мадэль напачатку выяўляецца як апазіцыя горад – вёска. Пісьменнік не аддзяляе непранікальнай сцяной горад і вёску. Аднак выявы апошняй прадстаўлены ў тэксце вельмі скупа. Толькі на самым пачатку твора Г. Марчук уводзіць апісанне хутара, дзе жыве галоўны герой рамана. Гэта, як і апісанне паездкі ў вёску на аўтобусе, у сваю чаргу спрыяе захаванню “адкрытасці” горада пазагарадскому жыццю. Аўтар выкарыстоўвае розныя спосабы мастацка-моўнага выяўлення эмацыянальных уражанняў герояў пра вёску: няўласна-простая мова: “Вырашылі так: шукаць самую нязначную магчымасць, любую зачэпку, каб утрымацца ў сталіцы, увесь год рыхтавацца і паступаць нанава” [3, с. 179]; простая мова герояў: “Жыві, брат, карыстайся газам, гарачай вадой, туалетам… Работу знойдзем. Назад у вёску вяртаюцца толькі аднаклетачныя ды інваліды” (Міхась Сокал) [3, с. 179]; “Цяпер усе горад хаюць. Хлусня. Як успомню наша жыццё на хутарах з блохамі, клапамі, цяжкую працу… як кажуць, косці ламае, вочы коліць” [3, с. 236], “Там туга

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

непралазная” [3, с. 236], “Не… я не змог бы тут жыць. Не змог бы! За гэтыя пяць гадоў адвык!” (Сава Дым) [3, с. 251].

Горад вабіць і прыцягвае, але для Савы адкрывае свае не самыя лепшыя бакі. Гэта ўжо не культурная сталіца, якой Мінск уяўляўся напачатку твора, а толькі прэтэнзія на яе. Іронія пісьменніка заключаецца ў тым, што Дым працуе ва ўстановах культуры і разам з тым гэтую “культуру” страчвае ў пагоні за лёгкім жыццём. Адкрыўшы свае спакусы, горад уцягвае ў вір п’янага вяселля, гулянак, распусты, вучыць, як дабівацца сваіх мэт, пазбавіўшыся сумлення. Добра засвоіўшы ўрокі гарадскога жыцця, хлопец выпрацоўвае сваю філасофію: “Чалавек слабы, трэба толькі вывучыць яго слабасці, і з ім будзе лёгка” [3, с. 235–236]; “Пасада, званне, адукацыя – добра для грошай. Сутнасць – першым паспець да карыта” [3, с. 236]. У гэтым, на думку героя, заключаецца асноўная мэта існавання. Жыццё Савы – бясконцая чарада шэрых будняў, напоўненых выпадковымі знаёмымі, змена каханак і паламаныя лёсы людзей. Герой не праходзіць выпрабавання горадам, які паглынае і падпарадкоўвае сабе асобу чалавека, не здатнага нават зразумець, што духоўнае жыццё, цеплыня стасункаў, каханне, сапраўднае сяброўства праходзяць міма яго.

Выклікае цікавасць той факт, што ўспрыманне горада яго жыхарамі праходзіць пэўную эвалюцыю па спіралі: ад страху перад месцам, невядомым і чужым, да захаплення гарадскім жыццём, і ўрэшце горад зноў нібы становіцца чужым і расчароўвае: “Ім абаім не хацелася вяртацца ў вёску, іх надта **прывабліваў горад**, марылі набыць гарадскую прафесію” [3, с. 179] (тут і далей вылучана мной. – *Л.І.*); “Паступова, як бы неўпрыкмет **чужы горад рабіўся даступны.** Ужо не так палохалі цёмныя двары, пад’езды, глухія вулачкі” [3, с. 214]; “Завіс над стомленым горадам месяц, **палохаючы** сваім вечным таямнічым непазнавальным лімонна-малочным святлом” [3, с. 293]; “Дваццаць гадоў я **змагаўся з горадам і не адужаў яго**. Дваццаць гадоў я быў прапісаны ў інтэрнаце і так і не атрымаў кватэру” [3, с. 342]; “Трэба было нешта рабіць. Найперш сэрца падказвала кінуць работу. Змяніць абставіны. Выбрацца прэч з **абрыдлага горада**” [3, с. 344]. Такое адлюстраванне рэчаіснасці горада ў пачуццёвым свеце яго жыхароў паказвае на значныя псіхалагічныя зрухі ў грамадстве. Адбываецца страта наіўных поглядаў на гарадское жыццё і прыходзіць паступовае разуменне, што душэўны камфорт чалавека не залежыць ад спрыяльнасці побытавых умоў.

Беларуская літаратура ў другой палове XX стагоддзя пры адлюстраванні горада часцей за ўсё закранае праблемы суіснавання вёскі і горада (апазіцыя вёска–горад). Можна гаварыць пра існаванне такой з’явы, як вёска ў горадзе ці “сена на асфальце”, што звязана з непасрэднымі гістарычнымі ўмовамі развіцця беларускай краіны. Яна атрымала сваё найменне дзякуючы твору М. Стральцова. Формула “сена на асфальце” (І. Запрудскі) характарызуе літаратуру 1950 – 1960-х гадоў пра горад (“Блакітны вецер”, “Сена на асфальце”, “І зноў, зноў горад” М. Стральцова). Паступовы адыход ад яе назіраецца ў рамане “Сава Дым і яго палюбоўніцы” Г. Марчука. Для пацвярджэння думкі супаставім горад у рамане апошняга з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

апавяданнем М. Стральцова “Блакітны вецер”, дзе больш дэталёва прадстаўлена апісанне гарадскога пейзажу ў параўнанні з іншымі названымі творамі пісьменніка. У апавяданні чытаем наступнае апісанне гарадскіх рэалій: “Адразу ж абступіў яго пах фарбы, халоднай тынкоўкі і пылу – заўсёдны пах пад’ездаў, скупа падпраўлены цёплым духам чалавечага жытла. Расціснутыя абцасамі, на пляцоўцы валяліся недакуркі” [5, с. 75]; “Гэта нават яшчэ не вуліца была, а проста дарога: дамы тут стаялі з аднаго толькі боку. Справа, затулены нейкімі майстэрнямі, цягнуўся нешырокі пустыр, аж пакуль не ўставаў на яго шляху адзінокі, вясковага выгляду дамок. Дарога за ім збочвала ў яшчэ адну, шырокую вуліцу. <…> Несучы зялёны агеньчык, з-за адзінокага доміка вышмыгнула таксі, пранеслася паўз Лагацкага” [5, с. 78]. М. Стральцоў у гэтым творы паказвае начны горад. Звяртае на сябе ўвагу факт выяўлення горада як пастаяннай будоўлі, што сцвярджае яго няспынны рух і павелічэнне. Падобныя прыкметы росту горада мы маем і ў рамане Г. Марчука пры паказе начной паездкі Савы на таксі ў адзін з новых раёнаў Мінска. Аднак М. Стральцоў паказвае горад як антураж дзеяння, яго ўспрыманне героем дазваляе заглыбіцца ў душэўны стан персанажа, чаго амаль не назіраецца ў Г. Марчука. Разам з тым агульнай з’яўляецца тэндэнцыя выяўлення горада як разамкнутай прасторы, што не траціць сувязей з вёскай. Гэта ў абодвух творах выяўляецца з дапамогай топаса дарогі, варыянтам якой можа быць чыгунка: «Так, аглядаючы ўсё наўкол сябе, дайшоў Лагацкі да чыгуначнага пераезда і спыніўся там. <…> І як бы дачакаўшыся чалавека, пранізліва і тонка азваўся недзе наперадзе паравоз. “Трэба абавязкова з’ездзіць у вёску, да маці, – адзначыў сабе Лагацкі”» [5, с. 79]. У апавяданні паказана ўспрыманне гарадскога пейзажу толькі Лагацкім, праз прызму яго настрою, і падаецца малюнак, што выяўляе толькі адзін бок горада, тады як Г. Марчук рэпрэзентуе рознавектарную рэцэпцыю розных персанажаў.

Разам з тым было б немэтазгодна гаварыць і пра тоеснасць дадзенага вобраза ў творчасці Г. Марчука і больш маладых сучасных аўтараў (А. Казлова “Горад у нябёсах (учора, сёння, заўтра)”, М. Южыка “Горад, які яны засялілі”). У названых творах горад выступае як прасторава-часавая мадэль, гэтаму спрыяе выкарыстанне ўрбаністычнага хранатопу, пад якім Н. Пазняк разумее “сувязь часу і прасторы, якая выражаецца канкрэтнымі топасамі, якія ў сваю чаргу трэба тлумачыць праз устойлівыя дадзенасці, канкрэтныя аб’екты, што ў літаратурным творы заканамерна паўтараюцца ў якасці дэталей і элементаў сюжэтаў” [4, с. 36]. Дзеянне ў аповесці А. Казлова адбываецца, як і ў рамане Г. Марчука, у Мінску. Можна знайсці і падабенства ва ўспрыманні горада галоўнымі героямі. Для Антака Перуновіча, героя аповесці, своеасаблівым выпрабаваннем становіцца пераезд з забруджанай радыяцыяй вёскі ў “**монстрападобны і страшна-незразумелы**” горад, які “**прыцягваў і палохаў, прымаў і адштурхоўваў, забаўляў і пудзіў**…” [2, с. 30]. Перуновіч адчувае ў горадзе нейкую татальную адзіноту сярод іншых людзей: «Антак адзін. Сам-насам з вялікім горадам <…>. Ніхто табе не патрэбны, і ты ўсім да лямпачкі. Парадокс... а мо, усяму віной *індывідуалізацыя* <…>. “Можа, адзінота гараджан праяўляецца ці, лепш сказаць, з’яўляецца вынікам недахопу

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

месца, прасторы... Чаму ж тады мы імкнёмся ў агромністы статак, паўзём усімі праўдамі і няпраўдамі ў мегаполісы з крынічна-светлых вёсак, пасёлкаў, мястэчак... Відаць, убіваючыся ў горад, мы хочам спраўдзіць спрадвечную жывёльную наканаванасць: у статку прасцей і лягчэй выжыць”» [2, с. 35]. На гэтым падабенства і заканчваецца. А. Казлоў дадае новыя канатацыі да вобраза горад, калі стварае яшчэ адзін вобраз горада-прывіда, своеасаблівага мройнага горада, які бачыць Антак і некаторыя іншыя героі твора. Гэты вобраз у аўтара выступае як рай. Мройны горад А. Казлова – “краіна Продкаў”, жыхары якой карэкціруюць паводзіны жывых людзей. Ілюзорны горад сустракаем і ў М. Южыка ў “Горадзе, які яны засялілі”, толькі роля яго іншая. Віртуальны горад М. Южыка, зачараваны, без жыхароў, населены ў далейшым прывідамі-зданямі, становіцца для галоўнага героя Хрыбоціча пеклам, турмой, горадам-катам, у якім герой асуджаны на самотніцтва. Мройны горад дазваляе аўтарам адлюстраваць псіхічныя перажыванні герояў.

Разгляд *горада* – шлях да спасціжэння мастацкага свету твораў, што дапамагае асэнсаваць змест жыцця герояў, прычыны іх паводзін, канфліктаў, узаемадачыненняў з рэальнасцю, светам і людзьмі. У рамане “Сава Дым і яго палюбоўніцы” Г. Марчука горад выступае цэнтрам, які вызначае сацыяльна-псіхалагічны і каштоўнасна-маральны стан грамадства, горад атрыбутаваны аўтарам як свет сучаснага чалавека. Вобразы горада ў культуры з’яўляюцца фактарамі змянення, сродкамі фіксацыі і самаідэнтыфікацыі сацыякультурных сістэм.

Літаратура


1. Акудовіч, В. Уводзіны ў новую літаратурную сытуацыю. Лекцыі для Беларускага Калегіума / В. Акудовіч // Фрагмэнты філязофіі, культуралёгіі, літаратуры. – 2009. – № 1–2. – С. 174–207.
2. Казлоў, А. Горад у нябёсах (учора, сёння, заўтра) / А. Казлоў // Маладосць. – 2008. – № 1. – С. 22–46.
3. Марчук, Г. Вочы і сон ; Сава Дым і яго палюбоўніцы : раманы / Г. Марчук. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 381 с.
4. Пазняк, Н. М. Аспекты вывучэння катэгорыі *горад* у літаратуразнаўстве / Н. М. Пазняк // Міжнародныя Шамякінскія чытанні “Пісьменнік – Асоба – Час” : матэрыялы II Міжнар. навук.-практ. канф., Мазыр, 20–21 кастрычніка 2011 г. МДПУ імя І. П. Шамякіна ; рэдкал.: А. У. Сузько (адк. рэд.) [і інш.]. – Мазыр, 2011. – С. 33–38.
5. Стральцоў, М. Выбранае : проза, паэзія, эсэ / М. Стральцоў. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 607 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ